У 76
1939

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Работніца і калгасніца Беларусі №10

С. Кирсанов.

СЕРОВУ

Он был
настоящим героем,
родным человеком—
стране.
Мы
прах
замуруем в стене,
но память о нем
не зароем.
Я знал его
близко, в лицо,
и вместе
мы тост подымали
за жизнь,
за высотные дали
с пятеркой
его удальцов.
Все небо
винтом перемерив,
он им
надышался не всласть,
Но слава его
занеслась
за дальний хребет
Пиринеев.
Над дымом
пожаров и зорь,
на пасмурном небе
событий—
его штурмовой истребитель
шел
молниеносной грозой!
Он был
замечательный парень!
Чудесной,
большой чистоты,
с ним сразу
хотелось—на ты,
с ним пелось
в особом ударе!
Был цвет его глаз
несуров,
и небо
московского мая
синело,
полет принимая:
—Летит
Анатолий Серов!
Как жалко
прощаться
с такими!
Как строг в карауле
отряд!
В квадраты
тяжелых утрат
как горестно
вписывать имя!
Как страшно,
что смерть,
осмелев,
в захлебе
моторного гула
подкралась к нему
и швырнула
и—
придавила к земле ...
Товарищи
жизни летучей!
Приложим
к пилотке ладонь!
Погиб
командир молодой ...
Подымемся
в темные тучи,
поспорим
с туманом крутизн,
и впишем
последнее слово,
любимое
слово Серова,
увитое трауром:
жизнь.

М. Светлов

ПОЛИНЕ ОСИПЕНКО

Сквозь легенды, сказанья, былины
Далеко ль до бессмертья итти?
«Очень близко!»—сказала б Полина,
Но не может произнести...

Ни слезой, ни печалью не надо
Омрачать наш прощальный салют,
Если с русскою женщиной рядом
Боевые легенды идут.

Этот образ знакомый и милый
Разве время от нас заслонит?..
Вся страна перед свежей могилой
Близким родственником стоит.

И никто не пройдет стороною,
Каждый замысел, каждый порыв,
Все мечты свои перед тобою,
Как живые цветы, положив,

Чтоб сквозь годы другим поколеньям
Славу женщины передать
Самолетом, стихотвореньем,
Всем, что может быстро летать!

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ. ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б № 10. Май 1939 г.

На вокладцы: Хатняя гаспадыня Э. П. Соукуп, якая скончыла курсы камандзіраў хімічных звенняў пры Сталінскім райсавеце Асоавіяхіма і атрымала званне інструктара абароннай работы. Фото Я. Салавейчыка.

Герой Совецкага Саюза А. К. Сероў

Герой Совецкага Саюза П. Д. Осіпенка.

Краіна іх НЕ ЗАБУДЗЕ

11 мая пры выкананні службовых абавязкаў у рэзультаце паветранай катастрофы заўчасна загінулі Героі Совецкага Саюза, выдатныя лётчыкі, камбрыг Анатолій Канстанцінавіч Сероў і маёр Паліна Дзенісаўна Осіпенка. Няўмольная смерць вырвала з нашых радоў адданейшых, гарачых патрыётаў радзімы, аддаўшых усе свае сілы, усё сваё жыццё на славу нашай бацькаўшчыны.

Вестка аб іх трагічнай смерці была сустрэта ўсім совецкім народам з невыразным болем і глыбокім смуткам.

Паліна Осіпенка! Анатолій Сероў! Няма ў нашай краіне такога кутка, дзе-б не ведалі гэтых гордых сталінскіх сокалаў, заваяваўшых сусветныя рэкорды, праславіўшых магутнасць совецкай авіяцыі гераічнымі пералётамі. Ведалі іх і далёка за межамі СССР.

Цудоўным было іх кароткае жыццё. Сын уральскага гарняка і сам кваліфікаваны рабочы Анатолій Канстанцінавіч Сероў яшчэ з дзяцінства захапляўся авіяцыяй. Настойліва і ўпарта дабіваўся ён сваёй мэты. Скончыўшы авіяшколу, т. Сероў адразу-ж на практычнай рабоце праяўляе выдатныя здольнасці ў аўладанні лётным майстэрствам. Анатолій Канстанцінавіч Сероў тройчы ордэнаносец. За праяўлены гераізм пры выкананні спецыяльнага ўрадавага задання яму было прысвоена званне Героя Совецкага Саюза.

Жыццё Паліны Дзенісаўны Осіпенка было поўна мужнасці і адвагі. Яна плоць ад плоці дачка народа, адна з яго лепшых прадстаўнікоў. Цяжкім і бязрадасным было дзяцінства Паліны. Яна нарадзілася на Украіне 9-м дзіцём у сям'і селяніна-беднякa. Маленькай дзяўчынкай пазнала яна горыч кулацкага хлеба. У 1926 годзе Паліна разам з сям'ёй уступае ў калгас і новае жыццё захапляе ўсю яе. Яна прыкладная калгасніца, комсамолка, працуе на птушкаводнай ферме, актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці.

Аднойчы ў родным сяле Новаспасаўцы прызямліўся самалёт.—Жанчына можа навучыцца кіраваць гэтай машынай?—запыталася Паліна ў жанчыны, якая была на самалёце. Атрымаўшы станоўчы адказ, Паліна рашыла ва што-б там ні стала стаць лётчыцай. І гэта рашэнне яна хутка ператварыла ў жыццё.

Перамагаючы розныя цяжкасці, Осіпенка паступіла ў лётную школу. Упарта авалодвала ведамі. Начамі праседжвала за кнігамі. Не гледзячы на тое, што ў дзяцінстве толькі дзве зімы вучылася ў школе, яна адной з лепшых скончыла лётную школу ў 1932 г. у горадзе Севастопале.

У канцы 1936 года, Паліна Осіпенка прымала ўдзел ва ўсесаюзнай нарадзе жонак камандната і начальніцкага складу РСЧА. Тут яна выступіла з гарачай прамовай і абяцала таварышу Сталіну

лятаць далей і вышэй усіх жанчын свету. Вельмі хутка ўвесь свет упэўніўся, што гэта абяцанне з гонарам выканана. У 1937 годзе за 3 дні яна ўстанавіла 3 міжнародных рэкорды высотных палётаў.

Паліна Осіпенка сапраўды лятала далей, хутчэй і вышэй усіх жанчын свету. Са сталінскай пуцёўкай у руках яна, разам са сваімі падругамі, у мінулым годзе зрабіла беспасадачны пералёт з Севастопаля ў Архангельск,— ад Чорнага да Белага мора. Са сталінскай пуцёўкай у руках яна з Валенцінай Грызадубавай і Марынай Расковай на самалёце «Родина» у тым-жа годзе зрабіла беспасадачны пералёт з Масквы на Далёкі Усход, праляцеўшы без пасадкі каля 6000 кілометраў. За такі кароткі час выдатная лётчыца звязала поўдзень з поўначчу, захад— з усходам.

Увесь свет быў здзіўлен мужнасцю, вынослівасцю і гераізмам адважнай тройкі, праславіўшай імя совецкіх жанчын, імя Гераінь совецкага народа. Тры ордэны ўпрыгожвалі грудзь Паліны.

Паліна Осіпенка была членам Комуністычнай Партыі і гэта званне было для яе даражэй за ўсё на свеце. Як сапраўдны большэвік Паліна ненавідзела ворагаў і горача любіла совецкі народ. Яна была сапраўднай гарачай патрыёткай сваёй радзімы.

На Маскоўскай 7 абласной і 6 гарадской аб'яднанай партыйнай канферэнцыі 2 сакавіка 1939 года Паліна Осіпенка выступіла з гарачай прамовай. Яна гаварыла аб любві і адданасці совецкага народа да партыі Леніна—Сталіна, аб нашай непераможнай, магутнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, аб гатоўнасці совецкіх жанчын стаць на абарону сваёй радзімы.—«Капіталісты таксама забываюць аб высокім палітыка-маральным становішчы нашага народа, аб яго дружбе, аб яго патрыятызме. Яны забываюць і аб тым, што ў нас ёсць такі магутны рэзерв, як жанчыны. У іх жанчыны не пойдуць ваяваць. А нашы жанчыны пойдуць абараняць сваё шчасце, сваю радзіму,»—сказала Паліна ў гэтай прамове. Маскоўскія большэвікі абралі Осіпенка дэлегатам XVIII з'езда партыі.

Гарачая любоў да радзімы, да партыі, да вялікага Сталіна натхнялі маёра Паліну Осіпенка і камбрыга Серова на подвігі, на гераічныя справы. Яны аддалі радзіме ўсё сваё маладое, бурнае, выдатнае жыццё і ніколі не памеркне слава аб іх бессмяротных справах. Абодва яны былі чароўнымі людзьмі, скромнымі большэвікамі.

У цяжкія дні ўтраты, у дні, калі ўся краіна, як з роднымі дзецьмі развітвалася з імі, у газетах было змешчана аб іх мноства ўспамінаў сяброў і сваякоў.

«Краіна страціла выдатнага пілота, мужнага, халоднакроўнага, бясстрашнага. А мы страцілі друга. Шчырага, сардэчнага, простага. Бясстрашны, рашучы пілот, Паліна ў той-жа час была пяшчотнай, па жаночы мяккай,»—пісалі Героі Совецкага Саюза Валенціна Грызадубава і Марына Раскова.

Паліна Осіпенка горача заклікала совецкіх дзяўчат авалодаць лётным майстэрствам. Асабістым прыкладам яна даказала, што жанчыны могуць быць выдатнымі лётчыкамі. Гэты заклік памятаюць нашы жанчыны.

«Лепшым помнікам загінуўшым героям будзе наша выдатная вучоба па тэорыі самалёта, выдатная практыка і выдатнае аўладанне лётным майстэрствам,»—пішуць дзяўчаты-вучлёты Аршанскага аэраклуба.

Совецкія жанчыны прыкладаюць усе сілы, каб авалодаць ваеннай справай. Яны яшчэ лепш навучаюцца вадзіць самалёты, страляць з вінтовак і кулямётаў, абыходзіцца з процігазам. У грозны час, калі прыдзецца сутыкнуцца з ворагам, нашы жанчыны разам з усім народам будуць грудзьмі абараняць сваю бацькаўшчыну. І хоць не ўбачым мы ў прадстаячых бойках нашых гордых сокалаў, сталінскіх пітомцаў Паліны Осіпенка і Анатолія Серова, яны будуць з намі— у нашых сэрцах, у нашых перамогах!



На здымку: Героі Совецкага Саюза М. М. Раскова і В. С. Грызадубава ў ганаровым карауле ў Калонным зале Дома Саюзаў каля урнаў з прахам тт. А. К. Серава і П. Д. Осіпенка.

Фота Фішмана (Фотахроніка ТАСС).

В. ГРЫЗАДУБАВА
Герой Совецкага Саюза

ПАМЯЦІ ДРУГА

Совецкі народ страціў двух сваіх выдатных лётчыкаў. Назаўсёды пайшлі ад нас Анатолій Сероў і Паліна Осіпенка. Загінулі два адважных, мужных сталінскіх сокалы.

Лепшыя мае ўспаміны, самыя светлыя таварыскія пачуцці звязаны з нашай дарагой і незабыўнай Палінай. Аднаўляючы ў памяці ўсе нашы сустрэчы з ёю, сумесную работу, балюча і цяжка сазнаваць, што экіпаж «Родины» страціў назаўсёды лепшага свайго ўдзельніка.

Першы раз я ўбачыла Паліну, калі яна выступала ў Крэмлі на нарадзе жонак камандната і начальніцкага састава Чырвонай Арміі. Успамінаю яе моцную постаць на крэмлёўскай трыбуне, звонкі голас, прамяністыя вочы... Назаўсёды ўрэзалася ў памяць яе абяцанне лятаць вышэй, далей і хутчэй усіх дзяўчат у свеце.

Калі ў мяне зарадзілася думка аб вялікім пералёце на Усход, мы з Марынай Расковай пачалі камплектаваць экіпаж. Доўга мы перабіралі ўсіх вядомых нам лётчыц і нарэшце аднадушна рашылі, што лепш Паліны нам не знайсці. Так яно потым і аказалася.

Гэта было яшчэ да пералёту Паліны Осіпенка з Севастопаля ў Архангельск. Яна рыхтавалася тады да свайго палёту. Тым не менш, даведаўшыся аб маёй прапанове, Паліна прышла да мяне дадому разам з Марынай Расковай, і тут адбылося наша першае блізкае знаёмства. Пасля гэтай гутаркі ў мяне склалася думка аб ёй, як аб моцным, вытрыманым, спакойным і халоднакроўным лётчыку і ў той-жа час, як аб чалавеку з мяккай і сардэчнай натурай. Спалучэнне гэтых уласцівасцей выгодна адрознівала Паліну.

Кожная сустрэча, кожная гутарка, дні нашых сустрэч з Палінай характарызавалі яе як чулага і адзыўчывага таварыша, моцнага і валявога чалавека, выдатнага большэвіка цудоўнай сталінскай загартоўкі. Пасля нашай першай гутаркі Паліна разам з Марынай паехалі ў Севастопаль для падрыхтоўкі к палёту ў Архангельск. Не гледзячы на ўсю сваю занятасць, Паліна, аднак, знаходзіла час пісаць аб тым, як ідзе падрыхтоўка да іх палёту; яна цікавілася ўсімі справамі, звязанымі з нашым будучым пералётам.



Героі Совецкага Саюза (справа—налева): П. Д. Осіпенка, В. С. Грызадубава, М. М. Раскова.

Надышлі дні падрыхтоўкі да пералёту. Аднойчы мы з Палінай адправіліся ў трэніровачны палёт. У паветры здарылася паломка стабілізатара. У мяне вырвала з рук штурвал. Становішча было крытычнае. Аднак Паліна не разгубілася. Яна ўважліва разглядала, што іменна зламалася. Быў ужо такі момант, калі Паліна мела ўсе правы для таго, каб прыгаць з парашутам. Але яна гэтага не зрабіла. Убачыўшы, што я рашыла ісці на пасадку, яна спакойна засталася сядзець на сваім месцы.

Бліжэй усяго мне давялося пазнаёміцца з чароўнымі якасцямі гэтай выдатнай жанчыны нашага часу тады, калі мы лятелі з Масквы на Далёкі Усход. Нідзе так не пазнаецца чалавек, як у бядзе, у цяжкія мінуты яго жыцця.

Успамінаю наступныя факты, бліскуча характарызуючыя дарагую Паліну. Калі мы апусціліся на балота ў раёне Кербі і засталіся адны сярод глухой тайгі, то перш за ўсё пастараліся паведаміць аб сваім месцазнаходжанні. Усе нашы думкі звярнуліся да нашай радыёстанцыі. Дзень звычайна пачынаўся так: прачнуўшыся, мы размяшчалі на крыллях самалёта нашу рацыю, мне прыходзілася круціць ручку, а Паліна працавала на ключы. У той час яна адчувала сябе фізічна не зусім добра, але і выгляду не падавала. Без стомы яна пасылала ў эфір нашы перадачы. Напружаная работа да таго мяне ізматывала, што страчваўся апетыт, нічога не хацелася есці. Не гледзячы на сваё недамаганне, Паліна пяшчотна ахоўвала мяне, угаварвала адпачыць, прымушала снедаць.

Калі мы ўладжваліся ў самалёце на начлег, я клалася бліз-

жэй да адтуліны кабіны, а Паліна ўладжвалася спаць далей—к хвасту. Пры кожным шораху я прасыналася. Бачачы мой нервовы сон, Паліна супакойвала мяне, угаварвала не турбавацца і звычайна прыгаварвала:

— Ды ну іх к чорту гэтых мядзведзяў! Няхай ходзяць, не хвалюйся, спі мацней.

Ноччу звычайна было вельмі холадна, бо ў гэты час ужо наступілі замаразкі. Не гледзячы на футравую вопратку, мы вельмі мёрзлі. Паліне самой было вельмі холадна, але яна непакоілася аба мне, старалася саграваць мяне. Гэтага ніколі не забудзеш! Паліна паказала тады сябе выдатным таварышом, вялікім, уважлівым другам, адзыўчывым чалавекам.

Успамінаю, як моцна і многа непакоілася яна тады аб загінуўшай Марыне Расковай. Усе яе думкі былі сканцэнтраваны на Марыне, усе яе жаданні зводзіліся да таго, каб хутчэй выбрацца з нашага таежнага палону і як можна хутчэй арганізаваць пошукі штурмана. Паліна безупынна гаварыла, што чым хутчэй мы дабярэмся да людзей, тым хутчэй будуць арганізаваны пошукі.

Быў і такі выпадак. Увечары балотная дымка стварае абманчывае ўяўленне аб асобных прадметах. Асабліва гэта прыкметна на змярканні. Калі мы знізіліся, сонца зайшло. І вось нам здалося, што на ўзлеску варушыцца якісьці чалавек. Здавалася, што ён стаіць і трымае не то мех, не то парашут. Мяркуючы, што гэта была Марына, я ўзяла боты, бо ведала, што яна была ў унтах, захапіла трохі прадуктаў і пайшла на ўзлесак. Па дарозе разрывала на кавалачкі газету і адзначала імі адваротны шлях к самалёту.

Паліна не менш мяне турбавалася аб Марыне. Але яна літаральна са слязмі на вачах угаварвала мяне застацца, сцвярджаючы, што на ўзлеску стаіць не чалавек, а мядзведзь, і што ісці да яго з адным рэвальверам досыць рызыкоўна. Сапраўды, на ўзлеску быў мядзведзь. Уважлівая, благаразумная Паліна засцерагла мяне ад небяспекі.

Цудоўны чалавек, добры таварыш і друг, Паліна была выдатным грамадчыкам, ніколі не забывала аб сваёй партыйнасці, аб сваіх большэвіцкіх абавязках. Калі мы выбраліся з балота і папалі ў населены пункт, Паліна перш за ўсё зацікавілася кнігамі і газетамі. Яна дастала надрукаваны ў газетах «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», сказала нам, што моцна адстала за час вымушанага прабывання ў тайзе, і стала займацца. Яшчэ да палёту яна збірала і падшывала газеты, у якіх былі апублікаваны раздзелы з «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Калі-ж мы

П. Д. Осіпенка

прыехалі ў Кербі, яна, не гледзячы на тое, што абстаноўка да гэтага не распалагала, доўга і многа займалася.

Вобраз Паліны Осіпенка заўсёды будзе яркім прыкладам для нашай моладзі. Патрэбны энергія, сіла волі, каб дабіцца пастаўленай задачы. Жыццё Паліны Осіпенка яўляе сабой наглядны прыклад, як трэба дабівацца мэты.

Усе яе пачуцці, усе яе думкі заўсёды былі напоўнены марамі аб творчай, сазідацельнай рабоце. Яна заўсёды імкнулася ўперад, не супакойвалася на дасягнутым, старалася дабіцца большага. Зварачаючыся ў Маскву, Паліна марыла, што гэты палёт не апошні, будавала ўсемагчымыя планы аб будучых вялікіх пералётах.

Калі Паліна атрымала званне Героя Совецкага Саюза, яна заявіла, што такі вялікі гонар, які аказалі ёй краіна і партыя, яна павінна апраўдаць сваёй работай. Справу партыі яна ставіла вышэй усяго. Яна прад'яўляла да сябе вялікія патрабаванні, упарта працавала і вучылася.

Памятаю яе хваляванне ў Кербі, дзе нас цёпла і радасна сустрэлі жыхары. Ва ўсіх нас было нейкае нялоўкае пачуцце, што вось, моў, людзі за нас турбуюцца, мы прыносім ім многа клопатаў і працы. Асабліва моцна перажывала ўсё гэта Паліна. Яе скромны характар ніяк не мог змірыцца з тым, што наша пасадка ў тайзе нарабіла краіне столькі клопатаў. Больш за ўсё яе непакоіла тое, што ўсё гэта можа ўсхваляваць таварыша Сталіна.

І трэба было бачыць яе радасць, яе шчаслівы твар, калі мы атрымалі прывітальную тэлеграму ад таварыша Сталіна і таварыша Молатава. Іх прывітанне прышло хутка пасля нашага тэлеграфнага рапарта аб рэзультатах палёту. Атрымаўшы радасную тэлеграму, я паказала яе Паліне і Марыне. Яны моцна стаміліся і ўжо збіраліся спаць. Але сталінскае прывітанне ўліло ў нас столькі энергіі, што ні аб якім сну не магло быць і гутаркі. Стомленасць як рукой зняло. Цяжка перадаць той настрой, які адчувалі ўсе мы ў той момант, але яшчэ цяжэй перадаць тыя пачуцці, якія ахапілі нашу мілую, дарагую Паліну. Некалькі разоў перачытвалі мы гэту тэлеграму і доўга спрачаліся, хто яе будзе захоўваць.

Назаўсёды з нашага цудоўнага жыцця пайшоў дарагі, горача любімы друг. Пайшоў чалавек, які так хацеў жыць, так хацеў працаваць на блага сваёй радзімы, для шчасця соцыялістычнай краіны.

Горасна і цяжка прымірыцца з думкай аб страце Паліны Осіпенка. Яшчэ так нядаўна я бачыла яе, гутарыла з ёй. Некалькі дзён назад мы былі з ёй у філіяле «Художественного театра», глядзелі «Піквікскі клуб». Седзячы ў ложы, мы доўга гутарылі аб гэтай п'есе. Паліна ажыўлена дзялілася ўражаннямі, расказвала аб найбольш спадабаўшыхся ёй месцах, абмяркоўвала ігру актораў. Уходзячы з

Тав. Осіпенка ў самалёце.

тэатра, я бачыла, з якім захапленнем акружаючыя глядзелі на Паліну, чула, як дзяўчаты гаварылі аб ёй.

Успамінаючы ўсё гэта, не верыцца, што мы больш не ўбачым гэтага чалавека, не пачуем яе голаса, не сустрэнемся з ёй.

Як дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, я атрымліваю многа пісем ад выбаршчыкаў, і кожны лічыць сваім доўгам перадаць прывітанне Паліне, запытаць аб ёй аб яе рабоце, аб яе жыцці, аб яе прадстаячых пералётах. Вялікага, добрага чалавека страціла краіна. Гэта цяжкая страта павінна яшчэ больш згуртаваць нашых лётчыкаў, нашу моладзь, мабілізаваць іх на вялікую сазідацельную працу, творчую работу. У памяць аб Паліне Осіпенка трэба рабіць вялікія і добрыя справы.

Усё яе жыццё можа служыць найлепшым прыкладам, як трэба любіць сваю радзіму, змагацца за шчасце совецкага народа, за справу большэвіцкай партыі, за ідэі Леніна—Сталіна.

(„Правда")

НАВУЧЫМСЯ ВАДЗІЦЬ САМАЛЁТЫ

Перастала біцца сэрца герояў нашага часу, бясстрашных сокалаў Паліны Дзенісаўны Осіпенка і Анатолія Канстанцінавіча Серова. Выдатнае, працоўнае жыццё правяла Паліна Осіпенка. Яна з дня ў дзень гераічна ішла ўперад, устанаўлівала рэкорды ў гонар нашай магутнай радзімы.

Паліна Дзенісаўна асвоіла многа тыпаў самалётаў. Яна захаплялася высотнымі палётамі і з кожным разам узнімалася ўсё вышэй і вышэй. Пачынаючы ад 5 тысяч метраў у верасні 1936 года т. Осіпенка дасягнула вышыні 9 тысяч метраў. Ні адна жанчына-лётчык у свеце так высока яшчэ не лятала. Яна—гэта адважная лётчыца лятала лепш за ўсіх, вышэй усіх, далей усіх і хутчэй усіх на свеце лётчыц.

Нам добра памятаецца, калі Паліна Дзенісаўна Осіпенка прыязджала ў Оршу пасля таго, як зрабіла разам з сваімі таварышкамі Грызадубавай і Расковай выдатны пералёт Масква—Далёкі Усход. І як прыгожа яна гаварыла аб сваім пералёце. Калі гаварыла аб тым, як стала лётчыцай, мы з захапленнем слухалі яе і нам хацелася гэтак-жа хутка і добра авалодаць лётнай справай.

Раптам пранеслася страшная вестка аб цяжкай страце двух герояў—лётчыкаў Паліны Дзенісаўны Осіпенка і Анатолія Серова. Абарвалася жыццё самых дарагіх, самых любімых людзей, гарачых патрыётаў совецкай краіны. Не хапае слоў, каб выказаць увесь смутак, гора.

Лепшым помнікам загінуўшым героям тт. Осіпенка і Серову будзе наша выдатная вучоба па тэорыі самалётаў, выдатная практыка і наогул выдатнае аўладанне лётным майстэрствам. Уся краіна, увесь свет не забудзе выдатных лётчыкаў.

Мы, вучлёты, абавязваемся глыбока авалодаць лётнай справай, на «выдатна» асвоіць самалёт і таксама паспяхова прадаўжаць маршрут нашых дарагіх і любімых герояў.

У любы момант, па першаму закліку партыі і ўрада мы будзем гатовы раздавіць фашысцкую гадзіну і «гора будзе таму, хто пасмее напасці на недатыкальнасць нашых граніц. Мы свае самалёты павядзем туды, адкуль вораг пасмее напасці. Мы не дадзім літасці ні аднаму ворагу, які адважыцца пасягнуць на нашы свяшчэнныя граніцы».

Бывайце-ж нашы друзья, нашы слаўныя сокалы!

П. Нахаева, Г. Гуроўская—
вучлёты Аршанскага аэраклуба

14—15 мая малады пілот паветраплаваць Аля Кандрацьева зрабіла выдатны палёт на сферычным аэрастаце „СССР—ВР•31• аб'ёмам у 335 кубаметраў, устанавіўшы 17 рэкордаў працягласці і дальнасці палёту.

На здымку: А. П. Кандрацьева.
(Фотахроніка ТАСС)

ПАДЗЯКА РОДНАМУ СТАЛІНУ

Я настаўнічаю 40 год. У стары праклятый царскі час настаўнік не жыў, а пакутваў, бо над ім здзекваліся хто толькі хацеў. Жыццё настаўніка, служба яго залежалі і ад старасты сяла, і ад папа, і ад апякуна школы—часцей за ўсё чорствага эгаіста, звера, а не чалавека. Залежаў настаўнік і ад земскай управы, дзе сядзелі памешчыкі. Настаўнік атрымліваў 15—25 рублёў. Ён быў зусім незабяспечаны.

Земскія начальнікі, памешчыкі, як апекуны сельскіх школ, здзекваліся не толькі над настаўнікамі, яны здзекваліся і над вучнямі—дзецьмі сялян. За кожнае глупства дзяцей білі, не клапоцячыся аб іх адукацыі, выхаванні.

Зусім іншае становішча зараз. Бязмежна шчасліва наша дзетвара. Перад ёй адкрыт шырокі шлях у жыццё, яе чакае цудоўная будучыня.

Змянілася і становішча настаўніка. Цяпер настаўнік з'яўляецца цэнтральнай фігурай у школе. Аб ім клапоцяцца партыя, урад, аб ім клапоціцца бясконца дарагі, родны друг, бацька наш Іосіф Вісарыёнавіч Сталін.

Перажыла я многа. Многа бачыла гора. Адчула жахі праклятага мінулага. У маім жыцці тады не было ні аднаго радаснага дня. Гэта было не жыццё, а пакута. Сапраўднае жыццё пачалося ў мяне толькі пасля Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі. Толькі тады я пазнала, што такое радасць. Але такой радасці, якую адчуваю зараз, я не адчувала яшчэ ніколі. Ніякімі словамі перадаць яе немагчыма. Я ў ліку многіх сельскіх настаўнікаў атрымала самую высокую узнагароду—ордэн Леніна. Я бязмежна шчасліва, што маю шматгадовую работу ацанілі партыя і ўрад.

Мне ўжо 62 года, з іх 40 год педагагічнай працы. Але для работы з маладым пакаленнем у мяне няма стомленасці і я з вялікай радасцю буду працаваць да апошняга біення сэрца на карысць маёй цудоўнай, любімай радзімы.

Уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, я аддаю ўсе сілы нашай шчаслівай совецкай дзетвары.

Я выкладаю нямецкую мову ў першай поўнай беларускай школе (5—10 класы), у няпоўнай рускай школе (5—8 класы) і ў вячэрняй школе. Дрэнных адзнак на апошнюю чверць не мае ні адзін з маіх вучняў. З адстаючымі я заўсёды займалася і займаюся дадаткова. Падцягваю іх і гэтым ліквідую адставанне больш слабых вучняў.

Выношу падзяку партыі і ўраду за высокую ўзнагароду, і самую вялікую ўдзячнасць ад усёй душы, ад усяго сэрца выношу правадыру народаў Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну.

Няхай жыве наш любімы правадыр таварыш Сталін, які даў нашаму народу шчаслівае жыццё!

Александра Варнаваўна Андруковіч—
настаўніца м. Цімкавічы, Копыльскага раёна.

ВЫХАВАЕМ ПАЛКІХ ПАТРЫЁТАЎ РАДЗІМЫ

Вялікая партыя Леніна—Сталіна высока ацаніла маю работу. Ад Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР я атрымала самую ганаровую, самую вялікую ўзнагароду—ордэн Леніна, ордэн генія чалавецтва.

Няма слоў, каб выказаць маё шчасце, маю радасць і маю ўдзячнасць. На працягу маёй 52-гадовай настаўніцкай работы я перажываю такі шчаслівы момант другі раз.

Першая радасць і шчасце былі ў 1917 годзе, калі Вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя з адной шостай часткі зямнога шара змяла ўладу памешчыкаў і капіталістаў і ўстанавіла ўладу рабочых і сялян.

Толькі пасля Кастрычніцкай рэволюцыі працоўныя масы атрымалі магчымасць вучыцца ва ўсіх навучальных установах і высока стала цаніцца работа настаўніка.

Да Вялікага Кастрычніка мне прыходзілася працаваць адной з чатырма класамі і 150 вучнямі ў халодным, вільготным і цесным класе. На 11 вёсак была толькі адна школа. Настаўнік быў забіты, бяспраўны чалавек. Цяпер совецкі настаўнік абкружан клопатамі партыі, урада і правадыра народаў І. В. Сталіна.

На нас настаўнікаў ускладзена ганаровая задача—выхаваць маладое пакаленне ў комуністычным духу і бязмежнай адданасці нашай Вялікай Радзіме.

Гэтую ганаровую задачу я выконваю аддана, з гонарам і любоўю. Запэўніваю наш урад, партыю Леніна—Сталіна і дарагога правадыра народаў Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна—пакуль буду мець сілы і здароўе, буду выхоўваць патрыётаў нашай шчаслівай радзімы.

Сардэчна дзякую вялікую партыю Леніна—Сталіна, урад і роднага Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна за шчаслівае жыццё і высокую ўзнагароду.

Елена Іосіфаўна Ціткоўская—
настаўніца Вільшынскай сярэдняй школы, Дзяржынскага раёна.

У Менску ў клубе імені Сталіна адбыўся канцэрт лаўрэата Міжнароднага конкурса ім. Ізаі ў Брюселе, ордэнаносца Марыны Казалупавай, лаўрэата Усесаюзнага конкурса музыкантаў-выканаўцаў, дацэнта Маскоўскай кансерваторыі Галіны Казалупавай і піяністкі Ірыны Казалупавай.

На здымку: Удзельніцы канцэрта—сёстры Казалупавы.

Фота І. С. Шышко (Фотахроніка БЕЛТА).

Заслужаная узнагарода

26 год назад, 16-гадовай дзяўчынкай Александра Міхайлаўна Былінская пачала настаўнічаць.

Не лёгка дасталася ёй прафесія настаўніцы. Рана страціўшы бацьку—сельскага настаўніка, Александра дзень працавала, а да позняй ночы рыхтавалася да экстэрна.

І вось нарэшце экстэрнам яна атрымала званне настаўніцы. Колькі радасці было тады маладой дзяўчыне! Пра новыя перспектывы, пра новае жыццё яна марыла...

Толькі мары засталіся неажыццёўленымі. Царскі лад зневажаў і ўсяляк ахайваў настаўніцтва. І калі ўвосень маладая настаўніца прыехала ў школу, першым яе сустрэў поп. Аб гэтай сустрэчы Александра Міхайлаўна расказвае:

— Не паспела я ўзыйсці на ганак, як мяне сустрэў поп і закрычаў: «Ты чаго? Навошта сюды ідзеш? Не трэба тут настаўніцы! Я сам спраўляюся з работай».

Надыходзіў вечар. У вёсцы няма нікога знаёмага. Поп начаваць не пускае. Што рабіць? Разгубілася Александра і заплакала.

Нарэшце поп «змілаваўся». Ён дазволіў пераначаваць у класе на партах. Назаўтра, у адным з класаў школы, па загаду папа ёй адгарадзілі невялікі куточак. У ім і жыла Былінская.

Кожны дзень прыходзіў поп у клас, перарываў заняткі і перад вучнямі пачынаў ахайваць Александру Міхайлаўну. Часта заганяў ён коз у яе «пакойчык», каб толькі пазбавіцца ад яе. Не мала сфабрыкаваў ён абражальных данясенняў і вышэйшаму начальству.

Ішоў 1917 год. Рабочы клас змятаў смецце з сваёй роднай зямлі. Змянялася аблічча гарадоў і вёсак, ствараліся новыя ўмовы працы. І толькі ў гэты час пачалі ажыццяўляцца юнацкія мары Александры аб новым жыцці, багатым неабмежаванымі перспектывамі. Совецкая ўлада акружыла бацькоўскімі клопатамі настаўніцтва. Тав. Былінская гаворыць:

— Я працую настаўніцай 26 год. З іх самыя радасныя і шчаслівыя гэта—21 год, якія я прапрацавала пры совецкай уладзе.

Пяць год працуе Александра Міхайлаўна ў Мар'іна-Горскай няпоўнай сярэдняй школе. Кожны год яна дабіваецца стопроцантнай паспяховасці. У гэтым годзе таварыш Былінская вядзе першы клас. У ім 48 шчаслівых дзяцей.

Скарыстоўваючы багаты, шматгадовы вопыт педагагічнай работы, т. Былінская дабілася і ў гэтым навучальным годзе выдатных рэзультатаў: у яе класе няма ні аднаго вучня з дрэннай адзнакай.

Александра Міхайлаўна ўмее зацікавіць рэбят кніжкамі, кіно, ведае жыццё і быт кожнага вучня. У яе асаблівы падыход да кожнага з іх.

— У маім класе,—расказвае т. Былінская,—ёсць вучань Мулік Фрыд. Ён любіў расхаджваць па класу, штурхаць рэбят, шумець у часе урокаў і перапынкаў. Усе ўгаворы мае, бацькоў і лепшых таварышоў не дзейнічалі. І вось аднойчы, зусім выпадкова я сустрэла ў газеце заметку аб дрэннай школе і вучнях. Неўзабаве пасля ўрокаў папрасіла Муліка застацца і прачытала яму гэтую заметку. Калі ён задумаўся, я адпусціла яго дадому. На другі дзень, у часе перапынку, ён падыходзіць да мяне і гаворыць: «Александра Міхайлаўна, я не буду больш дрэнным вучнем, абяцаю быць прыкладным!» За гэта я яго пахваліла. Праўда, спачатку цяжка яму было адвыкаць ад сваіх дрэнных учынкаў, але паступова ён іх кінуў.

Вялікае значэнне надае настаўніца агульна-адукацыйнаму развіццю вучняў. Яна праводзіць з імі гутаркі не толькі на ўроках, але і ў па-зашкольны час. Простай дзіцячай мовай расказвае аб навінах дня, новых кіно-карцінах, рэкамендуе кніжкі для чытання.

Часта яна сама чытае сваім вучням захапляючыя апавяданні.

Вялікую ўвагу зварачае т. Былінская на разгортванне соцыялістычнага спаборніцтва сярод вучняў. Прымае яна актыўны ўдзел і ў грамадскай рабоце.

Ордэн «Знак почета»—заслужаная ўзнагарода народнай настаўніцы Александры Міхайлаўны Былінскай.

Міх. Сіротко.

Пухавіцкі раён.



Узнагароджаная ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга старшыня райкома саюза работнікаў пачатковых і сярэдніх школ Гомельскага раёна Е. І. ІГНАЦЬЕВА (злева), узнагароджаны ордэнам Леніна загадчык Волатаўскай пачатковай школы—Н. А. Канцэвіч і дэпутат Вярхоўнага Совета БССР, загадчык Гомельскім Облана М. М. Прудніка.

Фота А. Шаевіча (Фотахроніка БЕЛТА).

Жанчыны Асіні

У гэтым годзе на Асінторфе да сезона падрыхтаваліся значна лепш, чым у мінулыя годы. У канцы красавіка пачалася здабыча торфу. Запрацавалі агрэгаты гідраторфу, на поле разліву паступіла гідрамаса. Прыступілі і да здабычы фрэзернага торфу. Завод у асноўным забяспечан рабочай сілай. Сюды прыехала ўжо каля 3.000 чалавек з калгасаў. І кожны дзень яшчэ прыбываюць новыя і новыя партыі рабочых.

Асінторф усё больш і больш аснашчаецца навейшай тэхнікай. Упершыню будуць пушчаны механізмы па ўборцы торфа. На фрэзерным участку дзве такіх машыны-агрэгаты пушчаны ў ход. Яны замяняюць каля 100 чалавек, што значна аблягчае работу тарфяніц, занятых на ўборцы фрэзера.

Таксама ёсць машыны, якія працуюць на ўборцы кускавога торфу. Яны будуць прасоўвацца па полі, збіраць высахшы кускавы торф і грузіць яго ў ваганеткі. Кожная машына замяняе ў сярэднім працу 50 работніц. У бліжэйшым будучым такіх машын тут будзе 13.

Амаль усе знатныя стаханаўцы і стаханаўкі-тарфяніцы, якія ў мінулым сезоне паказвалі ўзоры работы, зноў з'ехаліся на Асінторф. У гэтым годзе прыехала ўжо стаханаўка-тарфяніца т. Саўкіна з Бялыніцкага раёна. Тут працуе знатны брыгадзір па сушцы і ўборцы торфу т. Алейнікава, брыгадзір т. Пікуліна.

На фрэзерным участку працуе 10 жаночых брыгад. Усе яны перавыконваюць свае заданні. Брыгада т. Какошынай Дар'і ў красавіку выканала план на 185,2 процанта. Другое месца ў барацьбе за пяршынства па ўчастку заняла брыгада т. Саўкінай.

У выніку шырока разгорнутага соцыялістычнага спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі завод красавіцкі план выканаў на 102,2 процанта. Дасягнутыя поспехі замацаваны. Зараз усе 7 кранаў свае заданні выконваюць і перавыконваюць. Комсамольска-маладзёжная брыгада дае штодзённа 180 процантаў плана, а ў асобныя дні—200.

Тарфянікі і тарфяніцы гараць жаданнем перавыканаць дзяржаўнае заданне ў 400 тысяч тон торфа. Асінторф мае моцныя кадры. 177 радавых тарфянікаў вучыліся на розных курсах і зараз папоўнілі рады новай тэхнічнай інтэлігенцыі. Тут працуе 12 інжынераў, 98 тэхнікаў, сотні брыгадзіраў, дзесятнікаў, начальнікаў змен. Зусім нядаўна скончыла курсы брыгадзіраў па сушцы торфу 60 жанчын.

Жанчыны тут займаюць розныя камандныя пасты. Тэхнік Данілава Кацярына загадвае аддзелам тэхвучобы. Ніна Бейнаровіч—тэхнік кранаў вялікага гідраторфу. Гэта складаная і адказная работа, а т. Бейнаровіч спраўляецца з ёй нядрэнна.

На практычнай рабоце выраслі і сталі камандзірамі вытворчасці дзесяткі радавых тарфяніц. Вось дзесятніца Кацярына Пінчук. Яна на Асінторф прыехала ў 1934 годзе. Першы год працавала на фрэзеры. Работа на торфе зацікавіла Кацярыну і яна засталася на другі сезон. Як лепшую тарфяніцу ў 1935 годзе т. Пінчук прызначылі брыгадзірам. З гэтай работай справілася і таму на наступны год яе паслалі на курсы дзесятнікаў. З 1936 года т. Пінчук працуе дзесятніцай.

— Завод,—гаворыць яна,—з'явіўся для мяне школай. З цёмнай і малапісьменнай сялянкі я стала кіраўніком вытворчасці, кіраўніком некалькіх брыгад.

Так выросла не адна Кацярына Пінчук. Разам з ёю раслі многія

Брыгада тав. Прымінай (Асінторф) выконвае план на 200 проц. На здымку: тав. Прыміна са сваімі групаводамі. Злева на права ў першым радзе тт. Т. Д. Прыміна, Н. Ф. Красноўская. Другі рад В. П. Якубоўская, М. С. Баркоўская і Е. К. Кавалёва.

Фота І. Рабіновіча.

інторфа

тарфяніцы, цяпер знатныя людзі Асінторфа.

Вось т. Лейчанка. На завод прыехала ў 1933 годзе і горача палюбіла работу тарфяніцы. Працавала аддана, па-ўдарнаму. Многа працавала над сабой, праз год скончыла курсы матарыстаў машынафармоўкі. У 1935 годзе на заводзе ўпершыню быў прыменен спосаб вялікага гідраторфу. Тав. Лейчанка паставіла перад сабой задачу—стаць матарысткай вялікага гідраторфу і хутка гэтага дабілася. А зараз т. Лейчанка працуе дзесятнікам. Яна кіруе трыма брыгадамі. Усе брыгады выконваюць свае нормы больш чым на 200 проц.

На завод прыязджаюць лепшыя людзі з калгасаў. З Даманавіцкага раёна, з калгаса «Культура» прыехала пяць дзяўчат. Усе яны ў калгасе былі стаханаўкамі. Нядаўна ў пісьме ў свой родны калгас яны пісалі: «Асінторф—гэта цудоў[illegible]горад торфу. Рабочыя пасёлкі, [illegible]10, заліты электрычным свят[illegible]м. У кожнай кватэры—радыё. Тут свая амбулаторыя, больніца і аптэка. Свая школа. Амаль усё насельніцтва вучыцца. Мы таксама думаем прадаўжаць вучобу тут. Часта бываем у кіно—тут ёсць клуб з гукаўстаноўкай.»

І дзяўчаты запрашалі сваіх землякоў прыязджаць сюды. Захопленая расказамі калгасніца Анна Гарбар таксама папрасілася, каб калгас яе адпусціў на Асінторф. Яе адпусцілі. Зараз т. Гарбар працуе разам з дзяўчатамі свайго калгаса. Так растуць людзі на Асінторфе. Разам з гэтым расце і сам завод. З года ў год ён ператвараецца ў сапраўдны тарфяны Данбас Беларусі.

В. Кавалевіч, Н. Старавойтава.

Знатная тарфяніца

Работа на фрэзеры скончана. Брыгады прыводзяць у парадак свае інструменты. Анна Саўкіна аддала свой савок і шухлю другой, на хаду выцерла потны твар і падышла да нас. Мы селі і Саўкіна запыталася:

— А з чаго пачаць?

— З самага пачатку!

Дык вось. У 1935 годзе ў наш калгас «Чырвоны барацьбіт», Бялыніцкага раёна прыехаў вярбоўшчык. На сходзе ён расказаў нам аб значэнні Асінторфа, аб умовах работы.

Я згадзілася паехаць працаваць. Першы сезон працавала на фрэзеры. Потым зноў вярнулася ў родны калгас. Праз год на завод прыехала не адна, а ўгаварыла яшчэ некалькі жанчын. Зараз яны ў маёй брыгадзе.

У тым-жа годзе мяне вылучылі брыгадзірам. Прыходзілася адмаўляцца, што я яшчэ маладая і не здолею кіраваць людзьмі. Усё-ж гэта не дапамагло. Раз вылучылі, прышлося працаваць і працаваць так, каб не чырванець за брыгаду. А ў брыгадзе 23 жанчыны. Мы ўсе заключылі соцыялістычныя дагаворы паміж сабой, а таксама з другой брыгадай. Для спарнейшай работы брыгада разбілася на групы па 4 чалавека ў кожнай.

Паміж групамі таксама разгорнута спаборніцтва. Група Карпінай Праскоўі спаборнічае з групай Ольгі Харытонавай. Працуюць добра. У нас ёсць дзяўчаты, якія толькі што прыехалі з калгасаў. Яны арганізавалі сваё асобнае звяно. Я некалькі разоў паказвала ім працэсы работы і яны не адстаюць ад другіх звенняў. План перавыконваюць.

У дзень кожная з нас павінна ўбраць 5 тон торфу—гэта норма. Аднак у перыяд уборкі мы ў некалькі разоў яе перавыконваем. Мы ўключыліся ў спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. Мая брыгада зараз ідзе ўперадзе. За красавік план выканала на 171,3 процанта. Спадзяюся, што ў маі месяцы і ў наступных, брыгада будзе выконваць план не ніжэй як на 200 проц.

У гэтым годзе перада мной стаіць задача—дабіцца першай прэміі сярод усіх брыгад фрэзера. Праўда, брыгаду амаль штогод прэміруюць. У 1936 годзе яна была прэміравана тысячай рублёў. У 1938 годзе прэміравана два разы,—500 руб. і ў другі раз—800 руб.

Я на заводзе працую пяты год. Палюбіла работу на фрэзеры і стараюся, каб людзі маёй брыгады таксама засталіся тарфяніцамі. Наогул работа цікавая. І мы прыкладзем усе сілы, каб урадавае заданне ў 400 тысяч тон торфу завод выканаў.

Калі мы падняліся, на фрэзеры было пуста. Здалёку даносіліся песні дзяўчат.

Елісеева.

Шэсць дзяўчат з калгаса „Культура", Даманавіцкага раёна працуюць на Асінторфе ў брыгадзе тав. Алейнікавай.

На здымку: злева направа (першы рад) А. А. Гарбар, П. І. Алейнікава, А. Н. Гарбар, (другі рад) Н. С. Гарбар, Н. М. Повар, В. І. Верас і К. Ш. Гарбар.

Фото І. Рабіновіча

У стаханаўскім цэху

Абедзены перапынак. У абойна-матрацным цэху цішыня. Адна за адной прыходзяць у цэх работніцы. Колькі бадзёрасці, ажыўлення прыносяць яны з сабой.

Вакол аднаго з яшчэ няскончаных матрацаў сабралася група работніц. Ідзе ажыўленая гутарка, раздаецца звонкі смех.

Да пачатку работы застаецца 5 мінут і жанчыны пачынаюць разыходзіцца. Кожная ідзе да свайго месца. Некаторыя імкнуцца пачаць ужо работу, але прафорг не дазваляе,—яшчэ не скончан перапынак.

У цэх прыносяць драўляную раму з працягнутым у ёй дротам. Яе падхопліваюць быстрыя рукі, кладуць на козлы і ў некалькі мінут на зусім яшчэ нядаўна голай раме стаіць 40 роўных пружын. Першы працэс—ніжняя вязка скончана. Рама знімаецца. З хуткасцю маланкі падхоплівае яе другая работніца і пачынае другі працэс—верхнюю вязку пружын. Бачна толькі як мільгацяць рукі, як перакідваюцца канцы шпагата і праз некалькі мінут усё гатова.

Атрымаўся якісьці замыславаты ўзор з хітра пераплеценага шпагата і пружын. Узор нельга парушыць, бо гэта будзе азначаць, што работа зроблена дрэнна. Пружыны шчыльна стаяць адна да адной, іх не зварухнеш.

Вось канцы абрэзаны і другі працэс таксама скончан. Напалову гатовы матрац падхоплівае трэцяя работніца. Умелыя рукі пакрываюць яго палатном, прыбіваюць гэтае палатно. Далей прышываюцца барты. Нарэшце накладаецца стружка і нацягваецца цік. Гатоў прыгожы, добраякасны матрац.

Матрацы Менскага завода імені Молатава вядомы спажыўцу горада. Гэта найбольш танныя і моцныя з усіх астатніх, якія бываюць у продажы.

Матрацны цэх завода амаль выключна жаночы. З 33 рабочых—30 жанчын. Лічыцца цэх, і безумоўна па праву, стаханаўскім. План першага квартала быў выкананы к дню адкрыцця XVIII з'езда партыі—10 сакавіка. За ўвесь першы квартал план выканан на 140 процантаў. Цэх, як і ўвесь завод, уключыўся ў спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі і ўзятыя абавязацельствы выконвае.

— Нашы работніцы, — кажа начальнік цэха т. Ліўшыц,— працуюць добра, аддана. Я імі ганаруся.

Вось Маня Іваноўская. Гэта адна з лепшых стаханавак. Яна працуе параўнальна нядоўга ў цэху, але так асвоіла работу, што апераджае некаторых старых работніц. Або Ніна Лабецкая. Яна працуе толькі 6 гадзін—ёй 17 год. Але і за 6 гадзін яна перавыконвае план.

Ці ўзяць нашага прафорга. Яна мне вельмі многа дапамагае ў падняцці працоўнай дысцыпліны, і трэба сказаць, што дысцыпліна ў нас зараз добрая. Тав. Раманкевіч не толькі добра выконвае грамадскую работу, яна добрая стаханаўка—выконвае план на 150—160 процантаў.

Работніцы Лонская, Рамашэўская, Зубовіч таксама выконваюць норму на 150—160 процантаў, а тав. Карп на швейнай машыне—на 200 і больш процантаў.

— Мы працуем нядрэнна,— гавораць работніцы, але прыкладзем усе сілы, усе намаганні, каб працаваць яшчэ лепш на карысць нашай радзімы. Добрая работа—наша падзяка краіне за клопаты аб нас, падзяка роднаму Сталіну за шчаслівае жыццё, за яшчэ больш шчаслівае будучае нашых дзяцей.

Маршак.

Пры Менскім Доме Чырвонай арміі сістэматычна працуе гурток жонак начсклада па вывучэнню матэрыялаў XVIII з'езда партыі.

На здымку: Баявыя падругі—жонкі начсклада за вывучэннем сусветна-гістарычнага даклада правадыра партыі і народаў таварыша Сталіна. Чытае і растлумачвае даклад агітатар—старшы палітрук т. Цай (другі справа).

Фота І. Н. Казловіча (Фотахроніка БЕЛТА).

НА ВЫСТАЎКУ

Мы пазнаёміліся з Надзеждай Мачуленка на кватэры. Яна расказала нам аб цяжкіх годах у мінулым і аб выдатным жыцці зараз. Гутарка наша цягнулася не доўга,—не любіць т. Мачуленка многа аб сабе расказваць.

— Лепш я азнаёмлю вас з маімі красунямі, магчыма спадабаюцца,—пажартавала Надзежда Паўлаўна. Яна імкліва адчыніла вароты кароўніка і ветліва папрасіла зайсці.

— Мае «нявесты» размешчаны вось тут,—паказала т. Мачуленка. Мы перайшлі на правы бок кароўніка. Даярка, нібы вопытны экскурсавод, падыходзіла да кожнай каровы, шчыра, з сардэчнай цеплынёй расказвала аб іх, называла імёны сваіх красунь, не прапускаючы ніводнай рысы, дэталі.

— Гэта адна з лепшых кароў маёй групы,—паказваючы на «Моцю», сказала т. Мачуленка і пагладзіла яе прыгожую галаву. Карова перастала жаваць і паглядзела на сваю даярку, лізнуўшы яе руку.

— Яна стараватая, але годы не перашкаджаюць ёй даваць у сярэднім па 16 літраў малака ў дзень.—Мачуленка ўспомніла далей, як яна за добрую работу ўдзельнічала ў раённай сельскагаспадарчай выстаўцы, дзе яе прэміравалі.

«Моця» раней была незайздроснай каровай, давала, так як і астатнія, мізэрную колькасць малака. Старанны догляд, кармленне, па рацыёну, вопытнае даенне ператварылі карову звычайнай мясцовай пароды, зрабілі яе непазнавальнай: у 1938 годзе «Моця» дала 3000 літраў малака.

— Сёлета мы з «Моцяй» таксама не падкачаем. Я зраблю яе жыццё яшчэ больш прывольным, яшчэ больш сытым. Яна ў сваю чаргу мяне не падвядзе,—падорыць калгасу 3500 літраў малака,—выказала свае меркаванні т. Мачуленка.

Калгаснікі цэняць і паважаюць працу даяркі Мачуленка. Працуючы на калгаснай ферме без перапынку пяць год, Надзежда заслужыла ўсеагульную пашану сваімі штодзённымі клопатамі аб паляпшэнні соцыялістычнай жывёлагадоўлі, павышэнні яе прадукцыйнасці.

Да прыходу т. Мачуленка на ферму падаў маладняк, каровы давалі зусім нізкія ўдоі. Прапрацаваўшы на ферме адзін год, Надзежда патрабавала ад праўлення калгаса перавесці яе на здзельшчыну. Праўленне згадзілася. Ёй далі асобную групу кароў. Раней за догляд і даенне яна атрымлівала адзін працадзень. Пасля пераходу на здзельшчыну працадні сталі налічваць ад удою малака, упітанасці кароў, за вырошчванне маладняка.

— Самае галоўнае, самае важнае пры змаганні за павышэнне ўдойнасці—гэта вывучэнне індывідуальных асаблівасцей кожнай каровы,—гаворыць т. Мачуленка.—Я добра ведаю ўсе звычкі, капрызы кароў сваёй групы.

У 1938 годзе Мачуленка ад кожнай фуражнай каровы надаіла па 2000 літраў малака. У гэтым годзе яна абавязалася давесці сяэднегадавы ўдой да 3000 літраў. У гэтым годзе яна вырасціла ад 13 кароў усіх 13 цялят. Усяго за час работы на ферме яна вырасціла каля 100 цялят. Для таго, каб дабіцца яшчэ лепшай пастаноўкі работы на ферме, павелічэння ўдою малака, Мачуленка заключыла соцыялістычны дагавор з даяркай Лукер'яй Набок.

За добрыя поспехі ў галіне развіцця соцыялістычнай жывёлагадоўлі Надзежда Мачуленка зацверджана кандыдатам на ўдзел ва Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Макараў.

Камарынскі раён,
калгас „III Інтэрнацыянал"

У Мар'іна-Горкаўскім сельгастэхнікуме Пухавіцкага раёна лепшай стаханаўкай-даяркай лічыцца тав. Жываловіч А. А., якая дабілася ад 12 абслугоўваемых ёю кароў па 2.790 літраў малака ў сярэднім ад кожнай каровы. Яна зацверджана кандыдатам у экспаненты на Ўсесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку.

На здымку: Тав. Жываловіч з каровай-рэкардысткай „Дусей", якая дала за 1938 год 5.242 літры малака.
Фота І. Ф. Гнедзько (Фотахроніка БЕЛТА).



Стаханаўка-даярка калгаса-мільянера Ім. Куйбышэва, Бабруйскага раёна тав. Чарнецкая Е. Г. ад абслугоўваемых ёю 9 кароў дабілася ўдою ў мінулым годзе па 3400 літраў малака ад кожнай. А ад каровы „Белка" яна дабілася рэкорднага ўдою—7940 літраў. Тав. Чарнецкая зацверджана кандыдатам для ўдзелу ва Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

На здымку: Даярка тав. Чарнецкая з каровай-рэкардысткай „Белкай".
Фота Х. Малкіна (Фотахроніка БЕЛТА).

Узорна правядзем аздаравіцельную кампанію

Велізарнае значэнне ўдзяляюць партыя і ўрад фізічнаму выхаванню і аздараўленню совецкай дзетвары. Сотні тысяч рэбят праводзяць лета на дачах, у лагерах, санаторыях. Дзяржава адпускае на аздаравіцельныя мерапрыемствы вялікія сродкі. Клопаты аб здароўі нашых дзяцей павінны стаяць у цэнтры ўвагі кожнага грамадзяніна Совецкага Саюза.

У 1938 г. у БССР быў арганізаван рад аздаравіцельных мерапрыемстваў для дзяцей дашкольнага ўзросту: пасылка дзяцей у санаторыі, вываз дзяцей дзіцячых садоў на дачы, арганізацыя летніх аздаравіцельных пляцовак, правядзенне аздаравіцельнай работы на месцы, у дзіцячых садах, за кошт падаўжэння рабочага дня і палепшання якасці харчавання. Рэзультаты ўказаных мерапрыемстваў у мінулым годзе далі добрыя паказчыкі.

Так напрыклад у Магілёўскім дзіцячым садзе за два месяцы прабывання на дачы дзеці паздаравелі і паправіліся ад 1,5 да 3,5 кілограмаў (загадчык дзіцячым садам тав. Шапіра).

У дзіцячым садзе фабрыкі імені Клары Цэткін у горадзе Віцебску дзеці паправіліся ў вазе на два кілограмы ў сярэднім.

У 1939 годзе дзіцячымі садамі Менску, Віцебска, Магілёва, Гомеля будуць вывезены 6.900 дзяцей на дачу, а ў астатніх дзіцячых садах Беларусі, якія не выязджаюць на дачу, будзе падоўжан рабочы дзень і адпушчаны дадатковыя сродкі на палепшанне харчавання.

Для паспяховага правядзення аздаравіцельнай кампаніі ў гэтым годзе неабходна прыцягнуць увагу да гэтага ўсёй грамадскасці, у прыватнасці, прафсаюзныя арганізацыі, бацькоўскія камітэты і бацькоўскі актыў.

Яшчэ да выезду дзяцей на дачу неабходна азнаёміць бацькоў з задачамі і значэннем аздаравіцельнай кампаніі. Удзел бацькоўскага камітэта і наогул бацькоўскага актыва ва ўсёй рабоце па аздаравіцельнай кампаніі мае вялікае значэнне. Іх работа можа быць аказана ў дапамозе загадчыкам дзіцячых садоў, у мабілізацыі дадатковых сродкаў, набыцці дадатковага інвентара, у арганізацыі агародаў, кветнікаў, заключэнні дагавораў з



Група выдатнікаў 4-га класа Барковіцкай няпоўнай сярэдняй школы (Дрысенскі раён, Віцебскай вобласці).

Фото Л. А. Мазэлева (Фотахроніка Белта).

калгасамі на снабжэнне дзіцячых садоў прадуктамі, гароднінай і ў кантролі і праверцы ўсёй работы дзетсада.

У мінулым годзе паказальна быў арганізаван вываз дзяцей на дачу ў тав. Матусовай Ф. С. загадчыцы дзіцячага сада г. Віцебска. Своечасова была праведзена ўся падрыхтоўчая работа, быў скарыстан бацькоўскі камітэт і актыў бацькоў. Рэжым дня на дачы быў глыбока прадуман, які забяспечваў нармальнае жыццё дзяцей і садзейнічаў аздараўленню іх.

Заняткі з дзецьмі будаваліся рознастойна, жыва і цікава. Прыродныя ўмовы—сонца, паветра і вада скарыстоўваліся рацыянальна пад непасрэдным назіраннем урача. Рэбяты з дачы прыехалі здаровымі, загарэлымі і жыццерадаснымі. Лепшы вопыт мінулага года неабходна выкарыстаць цяпер.

Велізарнае значэнне ў правядзенні аздаравіцельнай кампаніі мае работа ўрача. Урач, звычайна, на бацькоўскіх сходах паведамляе бацькам аб правядзенні прафілактычнай работы ў дзіцячым садзе. Зачытвае правілы для бацькоў на дачы, каб збегнуць парушэнняў рэжыма дзіцячага сада і ўнясення інфекцый.

Работа ўрача ў цесным кантакце з выхавальнікамі дасць магчымасць улічыць індывідуальныя асаблівасці кожнага дзіцяці.

Пад кіраўніцтвам ўрача арганізуецца рэжым дзяцей на паветры. Як недахоп работы па аздаравіцельнай кампаніі ў мінулым з'яўляецца паслабленне выхаваўчай работы. З планаў работы педагогаў часта выпадалі ўстаноўленыя заняткі з дзецьмі.

Увага метадычных дашкольных кабінетаў інспектароў гор-АНА павінна быць звернута не толькі на праверку фізічнага аздараўлення дзяцей, але і на праверку і аказанне дапамогі ў лепшай пастаноўцы метадычнай работы.

Б. Шыфрына.

Начальнік дашкольнага кіраўніцтва Наркамата Асветы БССР.

Вучымся абараняць радзіму

Начальнікам групы самаабароны я стала нядаўна—з мінулага года. Пачала працаваць у групе ў 1936 годзе. Спачатку была радавым байцом.. Скончыла курсы камандзіраў звенняў, — прайшла 100-гадзінную праграму пры Сталінскім райсовеце АСО. Вось мая тэарэтычная падрыхтоўка.

Зараз наша група адна з лепшых па гораду і я хачу расказаць аб нашай рабоце, аб тым як мы дабіліся поспехаў.

Перш за ўсё мы ўзяліся за ўкамплектаванне звенняў, якія да гэтага часу не мелі сталага складу. Вылучылі начальнікаў звенняў. Пачалі рэгулярна праводзіць заняткі. Райсовет прымацаваў да нашай групы палітрука т. Рудніцкую, якая дапамагае нам праводзіць палітвыхаваўчую работу з хатнімі гаспадынямі.

Мы правялі рад дакладаў—аб міжнародным становішчы, аб міжнародным жаночым дні, аб пераліванні крыві, дэманстравалі фільмы абароннага характару. У нас рэгулярна выходзяць дзве насценгазеты. Адна газета — агульнагрупавая «За абарону СССР», другая—санітарнага звяна. Абедзьве газеты і выпускаюць і афармляюць самі жанчыны.

З вялікім інтарэсам і ахвотай наведваюць усе нашы байцы

Тав. Глозман.

заняткі, авалодваюць справай проціпаветранай абароны. У нас ёсць і свая маёмасць: процівагазы, процівапрытныя касцюмы і інш. Усё гэта захоўваецца ва ўзорным парадку ў нашай кладовай. Кожнае звяно мае ў гэтай кладовай сталае месца для хавання сваёй маёмасці.

Мы спаборнічаем з адной з груп самаабароны горада Кіева і прыкладаем усе намаганні, каб выйсці пераможцамі ў гэтым спаборніцтве.

14 сакавіка былі праведзены паказальныя заняткі, на якіх былі пасрэднікамі ўсе начальнікі аб'ектаў, груп самаабароны і камандзіры звенняў жыллёвай сістэмы горада. Заняткі мы рашылі правесці з тым, каб нам указалі на нашы недахопы, а мы, знішчыўшы гэтыя недахопы, маглі-б паставіць работу яшчэ лепш.

Атрымала група на занятках ацэнку «добра». Гэта азначала, што мы яшчэ не зусім добра авалодалі справай, што нам яшчэ трэба многа працаваць Мы пачалі яшчэ часцей праводзіць практычныя заняткі, яшчэ больш займацца з кожным байцом паасобку. Група прымала актыўны ўдзел і ў вучэбна-тактычных занятках па гораду (трывога).

І вось нарэшце мы ўсё-ж свайго дабіліся. Пры здачы групы, як баявой адзінкі штабу мясцовай проціпаветранай абароны, атрымалі ацэнку «выдатна». Гэта вялікі гонар для ўсіх нашых байцоў. Пяць чалавек з групы атрымалі значкі актывістак абароннай работы, чатыры чалавека прэміравала домакіраўніцтва і два—райсовет.

Вакол нашай групы згуртоўваюцца і астатнія хатнія гаспадыні. Мы прыцягваем іх да ўдзелу ў абароннай рабоце, у грамадскім жыцці. Пярвічная арганізацыя Асоавіяхіма выросла з 15 чалавек да 50. Кожны дзень паступаюць усё новыя заявы аб прыёме ў члены Асоавіяхіма. Білеты апошняй латарэі АСО былі распаўсюджаны вельмі хутка.

Да XVIII з'езда ВКП(б) з ліку хатніх гаспадынь, якія не ўваходзяць у групу самаабароны, мы падрыхтавалі 26 значкістаў. Байцы-ж нашай групы ўсе маюць значкі ППХА і ГСА першай ступені. Усе мы з'яўляемся членамі Асоавіяхіма і таварыства Чырвонага Крыжа.

Так мы змагаемся за авалоданне вайсковай справай, змагаемся за тое, каб кожная жанчына магла ў выпадку нападу ворага стаць на абарону нашай цудоўнай радзімы.

Глозман.

Начальнік групы самаабароны 162 домакіраўніцтва г. Менска

Санітарнае звяно групы самаабароны хатніх гаспадынь домакіраўніцтва 162. На здымку: Уперадзе: Берыла, (злева) Вігоцкая, (справа) Гайдзенка і Кумеша.

Е. САДОЎСКІ

Першае заданне

(Апавяданне)

На ўсю 16 армію гэта быў адзіны полк, які меў сваю паходную кравецкую майстэрню. Ніякімі статутамі і правіламі яна не была прадугледжана ў франтавых умовах і ўсё-ж гэта майстэрня існавала, абшываючы байцоў, клапоцячыся аб цэласці іх абмундзіравання.

Неяк непрыкметна прышла вясна 1920 года. Пышна распусціліся дрэвы, расцвілі, не лічачыся ні з чым, розы ў садочках каля хат. Камандзір палка—прыдняпроўскі рыбак, высокі, светлавалосы хлапец Пётр Ільіч Карнееў, які разам з байцамі, пераносіў няўзгоды цяжкай франтавой службы,—адвёў для майстэрні дзве крытыя павозкі і сурова загадаў не чапаць коней, вылучаных для краўцоў. Працаваць размясціліся на адкрытым паветры, шылі ўручную, толькі калі-некалі ў дарозе ў якой-небудзь сялянскай хаце ўдавалася пакарыстацца гадзіну другую «зінгераўскай» машынай.

Старшы майстэрні кравец Давід Хайкін—пажылы мужчына далучыўся да палка ў адным з беларускіх мястэчак, пасля таго як белапалякі па-зверску засеклі яго жонку і адзіную дачку—ненаглядную Лізачку. Гэты Давід Хайкін, якога празвалі, жартуючы, «іголачны генерал», паспяваў за гэты час і прыкраіць і прыстрачыць і нават прымераць.

У майстэрні (гэта, зразумела, сказана вельмі гучна) працавалі вядомы ўжо вам Давід Хайкін і дзве дзяўчыны—Любачка Зак і Марыя Блонь. Тры чалавека, а яны паспявалі абшыць увесь полк і неяк на аглядзе, зроблены у перапынку паміж баямі, сам камандарм пахваліў Карнеева за тое, што ва ўсіх яго байцоў гузікі былі на месцы. Давід Хайкін і Любачка Зак былі на «сёмым небе» ад гэтай скромнай пахвалы.

Любачка Зак, як і «іголачны генерал», далучылася да майстэрні ў адной з вёсак, дзе полк кватэраваў два дні. Люба рана засталася сіратой. З 12 год ёй давялося мытарыцца па дварах кулакоў, даглядаць жывёлу, няньчыць капрызных дзяцей, па начах не спаць. Змалку яна ўжо навучылася шыць. «Залатыя, рукі»,—гаварылі пра яе жаласлівыя сялянскія бабы, гледзячы як цяжка жывецца сіраціне па чужых дварах. У Любы быў брат Нікіфар, старэйшы за яе на 6 год, шырокаплечы, мужны хлапец, выглядаўшы старэй сваіх гадоў. Працаваў ён на кузні і калі пачуў, што ў былой воласці бяруць добраволыцаў у чырвоныя войскі—першым пайшоў у Чырвоную Армію. Люба горача абняла брата на развітанне, але не сказала яму, што і сама задумала зрабіць таксама, як толькі прадставіцца першая магчымасць. Давід Хайкін сваімі клопатамі замяніў ёй бацьку. Ён раздабыў новы шынель і сам перашыў яго Любе па плячу. Ён-жа ў гаспадарчай часці выпрасіў боты, якія зышлі з меркі.

Маруся Блонь, рослая вясковая дзяўчына, прыстроілася ў паходную майстэрню зусім нядаўна. Уласна, пасля яе прыходу, калі ў Давіда Хайкіна аказаліся дзве памочніцы, ён выпрасіў другую павозку спецыяльна для дзяўчат і пачаў патрабаваць ад камандзіра заказаў для «майстэрні», як ён пачаў называць.

— Давайце заказы! — горача запрашаў ён, забываючы аб тым, што вораг бродзіць дзесьці тут блізка і невядома ці будзе ў байцоў час пачакаць пакуль умелы кравец, «іголачны генерал» і ўвесь яго штаб паспеюць паправіць гімнасцёрку ці скажам фрэнч.

Аднойчы пад раніцу полк паднялі па баявой трывозе. Хайкін разбудзіў дзяўчат. На вёску напаў белапольскі раз'езд. Завязаўся крывавы бой. Белапалякаў спачатку адбілі, а потым разбілі да апошняга. Люба з вінтоўкай у руках ляжала за агарожай апошняй сялянскай хаты. Раптам да яе данесліся стогны. Яна пад стрэламі прайшла ўперад і ўбачыла каля трох адзінока росшых хвой параненага. Некалькі кулямётных куль заселі ў яго назе. Скрозь прабіты хромавы бот раўчукамі струменілася цёплая кроў. Паранены ляжаў закрыўшы вочы і цяжка стагнаў. Люба прыгнулася да яго і сваімі кволымі рукамі лепш палажыла байца, потым яна сарвала са сваіх плеч белую касынку і паспешна прыціснула рану. Хтосьці праходзіў міма. Яна паклікала. Санітарнай двуколкі не было. Раненага паклалі на павозку ад паходнай швейнай майстэрні. Увечары камандзір палка даведаўся аб самаадданым учынку дзяўчыны. Ён моцна паціснуў ёй руку і выклікаўшы ўрача—сказаў яму:

— Бярыце,—вось вам галоўная сястра!

Люба пачырванела. Давід Хайкін, які стаяў паблізу, горды за сваю выхаванку, хацеў задаць сваё звычайнае пытанне,—а якжа заказы?—але, убачыўшы з якім гонарам усе віншуюць адважную дзяўчыну, падышоў бліжэй да яе і сказаў:

— Любачка, хочаш мы самі пашыем табе прыгожы санітарны халат? Ідзі, ты там больш патрэбна.

З таго часу ў шпіталі з'явілася новая сястра. Дзе Хайкін дастаў такое цудоўнае мяккае палатно,—сказаць цяжка, але роўна праз тыдзень ён прынёс маладой сястры міласердзя прыгожы халат з чырвоным крыжам. Прымаючы скромны падарунак, Люба пачырванела, як яркачырвоны крыж, што гарэў на

новым белым халаце. Хворыя не маглі нахваліцца клопатамі і ласкавым доглядам новай сястры.

Здарылася, што ў адным з апошніх баёў ранілі камандзіра палка Карнеева. Чацвёра байцоў на прастых насілках занеслі яго ў прыгожы панскі асабняк, дзе часова змяшчаўся палкавы шпіталь. Насілкі былі запачканы крывёю, якая цякла з твару русавалосага камандзіра палка, маладога дваццаціпяцігадовага хлапца. Люба кінулася рабіць перавязку, рукі яе дрыжэлі, ёй здавалася, што яна надта рэзкая ў рухах, што камандзіру балюча і ў яе халадзела сэрца ад гэтай думкі. Але камандзір ляжаў закрыўшы вочы, не стогнучы, толькі вусны былі сціснутыя, быццам скаваныя. Калі перавязка была скончана, Люба думаючы, што Карнееў спіць, ціха адышла ад ложка, але ён адкрыў вочы і ціха сказаў:

— Хто мяне перавязваў? Вы, Любушка, я адчуваў якія пяшчотныя рукі...

— Таварыш камандзір, маўчыце,—вам нельга рухаць шчокамі, у вас прастрэлена правая шчака.

— А як-жа я буду клікаць у бой?—спалохана сказаў Карнееў і з цяжкасцю ўзняўся на локцях.

— Кладзіцеся, вось так, і супакойцеся.

Люба нервавалася—дзе ўрач? Яго шукалі ўсюды, але не знайшлі.

— Паехаў за медыкаментамі,— паведаміў веставы.

Пад вечар, калі ў Карнеева павысілася тэмпература і Люба стала баяцца, што ў кроў раненага папала інфекцыя — у дзвер пастукалі. Увайшоў чалавек у доўгім паліто, рагавых акулярах, хударлявы і сутулы; ад яго веяла чымсьці старажытным. Люба здзіўлена зірнула. Увайшоўшы прадставіўся:

— Мясцовы ўрач Пракошын. Мне перадалі, што ў вас цяжка хворы патрабуе дапамогі

Маладая сястра разгубілася. Яна паглядзела на Карнеева, які па-ранейшаму ляжаў маўкліва, дзесьці ўнутры мужна пераносячы пакуты і боль. Потым яна рашуча падышла да доктара і сказала:

— Так у нас ёсць ранены— камандзір палка. Калі ласка, агледзьце яго. Наш ваенны ўрач кудысьці паехаў.

Пракошын з гатоўнасцю зняў паліто і падышоў да хворага. Люба, яна заставалася адна ў палаце, не спускала вачэй. Хударлявы—з іезуіцкім тварам, ён памацаў пульс, адкрыў раненаму павекі:

— Сястра, прынясіце спірту. Я хочу абпаліць інструменты. Куля не забруднена?

— Здаецца не!

Люба выйшла на мінуту, а калі вярнулася — аслупянела,— хударлявы, абапіраючыся каленам аб ложак, душыў камандзіра палка.

І адкуль толькі ўзяліся сілы ў гэтай кволай дзяўчыны?! Першым, што падвярнулася ёй пад рукі—гэта цяжкае крэсла,—яна аглушыла мнімага ўрача. Карнееў ачнуўся. Ён прасунуў руку пад падушку, дзе ляжаў рэвальвер, Люба вырвала ў яго рэвальвер і выстраліла. Збегліся хворыя. Хударлявага звязалі. Карнееў, перасільваючы боль, прыцягнуў паблякнеўшую дзяўчыну і моцна паціснуў ёй руку...

Нядаўна я адпачываў у ваенным санаторыі на жывапісным беразе Чорнага мора. Там мне расказалі гэту праўдзівую гісторыю, знаёмячы з галоўным урачом здраўніцы Любоўю Осіпаўнай Зак.

„ЗАЛАТАЯ КВЕТКА“

У канцы мінулага года японцы са зларадствам паведамілі аб забойстве гераічнай кітайскай дзяўчыны і кіраўніка партызанскага атрада па імені Цай Цінхуа, што ў перакладзе на беларускую мову азначае «Залатая кветка». Японцы радаваліся рана. Газеты не так даўно паведамілі, што яна «ўваскрэсла» і паранейшаму граміць японскі тыл.

* * *

Калі японцы ў Цэнтральным Кітаі дасягнулі возера Тайху і разграмілі маленькі, у мінулым квітнеючы гарадок Чансін, у якім жыла «Залатая кветка» з сваімі бацькамі, яна пайшла ў горы і арганізавала партызанскі атрад. Хутка распаўсюджвалася слава аб гераічнай дзяўчыне— камандзіры партызанскага атрада. Хутка рос яе партызанскі атрад. Многа слаўных эпізодаў аб «Залатой кветцы» перадаецца з вуснаў у вусны.

Смеласць, выхаваная з дзяцінства, сказвалася ва ўсіх аперацыях «Залатой кветкі». Па яе распараджэнню 400 партызан «здаліся» ў палон японцам і перайшлі на службу ў адзін з буйных японскіх гарнізонаў. Праз некаторы час тыя, што «здаліся» паўсталі, знішчылі японскі афіцэрскі састаў і ахову складаў. Захапіўшы вялікую колькасць узбраення і амуніцыі, яны скрыліся з горада.

* * *

У адным з баёў японцам удалося захапіць у палон «Залатую кветку». Але апазнаць яе, як відаць, японцам не ўдалося. Партызаны рашылі ва што-б та ні стала выратаваць свайго камандзіра.

Аднойчы партызаны ўварваліся ў горад Чансін. У вулічным баі аказалася забітай жонка суддзі марыянетачнага ўрада. Партызаны, здзіўленыя яе падабенствам з «Залатой кветкай», рашылі ашукаць японцаў. Труп забітай быў апранут у адзенне «Залатой кветкі» і перадан японскім уладам. Зларадству японцаў не было канца. Яны былі глыбока пераконаны ў тым, што гэта быў труп «Залатой кветкі». Услед за гэтым партызаны перадалі «Залатой кветцы», якая знаходзілася ў турме, форму японскага салдата. Пераапрануўшыся, яна благапалучна ўцякла з зняволення, прайшла лінію японскай аховы і далучылася да свайго атрада, які аперыраваў на паўднёвым усходзе правінцыі Аньхуэй.

Жыццё і быт народаў Індо-Кітая (Французская калонія).

На здымку: Жанчыны племені Таі набіраюць ваду ў прымітыўныя драўляныя сасуды Фотахроніка ТАСС.

НАШ ПІНУЦЬ

ЖОНКІ ЧЫГУНАЧНІКАЎ ВЫВУЧАЮЦЬ МАТЭРЫЯЛЫ З'ЕЗДА

З аграмадным інтарэсам слухалі жанчыны-актывісткі даклад дэлегата XVIII з'езда партыі т. Байцова аб рабоце з'езда. Ён расказваў аб тым, у якой абстаноўцы праходзіла работа з'езда, аб велізарнейшай радасці кожнага дэлегата, з якой яны слухалі даклад любімага правадыра ўсяго працоўнага чалавецтва Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Пасля гэтага схода актывісткі з яшчэ большай энергіяй узяліся за вывучэнне матэрыялаў XVIII з'езда партыі і даклада таварыша Сталіна. Вывучэнне матэрыялаў і рашэнняў з'езда актывісткі станцыі Гораны ўвязваюць з авалоданнем абароннай работай. Старшыня жэнсовета т. Фёдарава абавязалася за кароткі час падрыхтаваць восем значкістаў проціпаветранай хімічнай абароны, трох варашылаўскіх стралкоў.

Актывісткі станцыі Віцебск, каб вывучыць матэрыялы XVIII з'езда, арганізоўваюць гурткі на кватэрах. Тав. Каваленка арганізавала гурток, які наведвае 20 чалавек. Праведзена ўжо некалькі заняткаў. Гурток па дыстанцыі пуці (старшыня жэнсовета т. Быдзан) займаецца рэгулярна — раз у пяцідзёнку. На занятках слухачы гуртковў, акрамя вывучэння матэрыялаў XVIII з'езда, абмяркоўваюць пытанні міжнароднага і ўнутранага становішча, вывучаюць геаграфію.

Па жэнсовету паравознага дэпо (старшыня тав. Вязоўская) арганізавана чатыры гурткі, з ахопам 130 чалавек. Сярод іх праводзіцца велізарная масавая работа.

О. Мілаева—інструктар палітаддзела (Віцебск).

ЗВЕННЯВАЯ

Было гэта ў лютым мінулага года. На сход калгаснікаў Елізавета Мітрафанаўна прышла першай. Яна доўга гутарыла з прадстаўніком раёна і потым пасля выступленняў калгаснікаў узяла слова. Тут-жа на сходзе і абавязалася атрымаць з кожнага гектара па 10 цэнтнераў ільнавалакна і 9 цэнтнераў ільнанасення.

— Абавязацельствы вялікія,— падумаў пра сябе кожны,—але яна справіцца.

Елізавета Вінаградава арганізавала звяно. Ахвотнікаў працаваць з ёю было многа. Першай у звяно запісалася яе сястра Анэта, а потым яшчэ 4 калгасніцы.

Старанна ўзялося звяно за работу. Сабралі ўгнаенне, ачысцілі насенне, а потым вечарамі збіраліся на кватэру да звеннявой і вывучалі асноўныя правілы агратэхнікі.

Надышоў час сяўбы. Апрацаваная глеба была засеяна высокакандыцыйным насеннем. Паказаліся ўсходы. Елізавета Мітрафанаўна са сваім звяном зрабіла падкормку, а праз некаторы час тры разы прапалола яго.

Лён рос на славу. Ён вабіў вока. Неўзабаве надышоў час уборкі. Яго своечасова ўбралі і апрацавалі. Елізавета Вінаградава стрымала сваё слова. Узятыя абавязацельствы поўнасцю выканала.

... Паміж прасторных калгасных палёў імчаўся цягнік. У адным з яго вагонаў сядзела яшчэ зусім маладая жанчына. Гэта ехала Елізавета Мітрафанаўна Вінаградава—звеннявая калгаса імені Кірава разам з перадавікамі сельскай гаспадаркі ў сталіцу нашай цудоўнай радзімы—Красную Маскву за атрыманнем ганаровай узнагароды—ордэна «Знак почета»...

У гэтым годзе Елізавета Мітрафанаўна змагаецца за атрыманне 13 цэнтнераў ільнавалакна і 10 цэнтнераў ільнанасення з аднаго гектара. **М. Сідаровіч.**

Кіраўскі раён.

АВАЛОДВАЮЦЬ ТРАКТАРАМ

Маладыя калгасніцы Совецкага Палесся горача адгукнуліся на заклік знатных трактарыстак студэнтак Тіміразеўскай акадэміі Пашы Ангелінай, Пашы Кавардак і другіх аб падрыхтоўцы 100 тысяч дзяўчат-трактарыстак без адрыву ад вытворчасці.

Сотні дзяўчат Палесся актыўна ўзяліся за вывучэнне трактарнай справы. У калгасе «Парыжская Комуна», Лельчыцкага раёна трактар вывучаюць 16 дзяўчат. У калгасе «17 з'езд ВКП(б)», гэтага-ж раёна 20 дзяўчат-калгасніц без адрыву ад вытворчасці набываюць навыкі кіравання трактарам.

Брыгадзір трактарнай брыгады Рудакоўскай МТС, Хойніцкага раёна т. Войтка абвучае трактарнай справе 28 дзяўчат-калгасніц сельскагаспадарчай арцелі «Комінтэрн». У калгасе імені Ільіча, Камарынскага раёна 12 маладых калгасніц актыўна вывучаюць трактар. Елізавета Нікалаева ўжо можа вадзіць трактар. Пры соўгасе імені Молатава гэтага раёна трактар без адрыву ад вытворчасці вывучаюць 9 калгасніц. Праведзена ўжо 7 заняткаў.

Трактарысты і брыгадзіры трактарных брыгад Ельскай МТС абавязаліся падрыхтаваць 86 дзяўчат-трактарыстак. Трактарыст т. Назарчук, які працуе зараз на палях калгаса «Чырвоная Данілаўка», правёў ужо некалькі заняткаў з калгасніцамі.

Добра арганізавана вывучэнне трактарнай справы ў калгасе «Ведрыч», Васілевіцкага раёна. Маладыя калгасніцы заяўляюць, што яны добра вывучаць трактар з тым, каб упарта змагацца за атрыманне высокіх сталінскіх ураджаяў на калгасных палях. Яны заяўляюць, што ў любы момант па закліку партыі і ўрада, вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна змогуць змяніць свае трактары на танкі і будуць граміць ворага на яго-ж тэрыторыі.

Мозыр. **Сара Шапіра.**

Парады ўрача.

ЯК ПРАВІЛЬНА КАРЫСТАЦЦА СОНЦАМ, ПАВЕТРАМ І ВАДОЙ

Партыя і ўрад надаюць велізарную ўвагу арганізацыі правільнага адпачынку і скарыстанню лекавых сіл прыроды для ўмацавання здароўя працоўных. Правільны адпачынак можна арганізаваць не толькі ў часе водпуску. Можна ўстанавіць такі рэжым на працягу ўсяго года, каб умацоўваць здароўе і павышаць прадукцыйнасць працы.

Што для гэтага неабходна? Зварачацца з прадпрыемства пры невялікай адлегласці можна пехатой,—прагулкі на паветры на працягу 20-30 мінут добра дзейнічаюць на арганізм. Застаўшыйся час абедзенага перапынку ў летні час пасля вытворчай, і пасля грамадскай работы, пасля вучобы і другіх работ трэба скарыстоўваць на свежым паветры: у парку, лесе, садзе, на беразе ракі і г. д. Неабходна весці барацьбу за свежае паветра ў кватэры, цэху, установах, класах.

Асабліва важнае значэнне мае ўменне скарыстаць лячэбныя сілы прыроды ў выходны дзень.

Неабходна карыстацца натуральнымі сіламі прыроды—сонцам, паветрам і вадой—магутнымі крыніцамі здароўя чалавека.

Цеплавыя і светавыя праменні сонца праходзяць глыбока ў тканіны арганізма і выклікаюць прыліў крыві да асветленага ўчастка, што з'яўляецца вельмі добрым рассасваючым і болезаспакойваючым момантам.

Акрамя таго, прамяністая энергія павышае супраціўленне арганізма да заразлівых захворванняў і дзейнічае як агульны ўмацоўваючы сродак.

ЯК КАРЫСТАЦЦА СОНЕЧНЫМІ ВАННАМІ

Прымаць сонечныя ванны неабходна толькі пасля таго, як вы параіцеся папярэдне з доктарам аб сваім здароўі.

Прымаць сонечныя ванны можна ўсюды, але пажадана выбіраць месца, якое звернута на поўдзень і якое абаронена ад ветра (лясная паляна, бераг ракі, тэраса і т. д.).

У першы дзень прымаць сонечную ванну не больш 5 мінут. У наступныя дні дабаўляць па 2—3 мінуты. Пасля таго, як на целе з'яўляецца агульны адценак загару, працягласць ванны ўстанаўляецца ад 10 да 45 мінут.

Пры прыёме сонечнай ванны трэба, каб паверхня цела была пад роўнамерным уздзеяннем сонечных праменняў.

Прымаць сонечныя ванны трэба да ежы ці праз дзве гадзіны пасля ежы. Нельга прымаць ежу зараз-жа пасля сонечнай ванны—гэта выклікае страту апетыту.

Прымаць сонечную ванну неабходна абавязкова лежачы, без вопраткі ці толькі ў трусах.

Галава павінна быць злёгку прыпаднята і закрыта белым ручніком, касынкай, хусткай.

ПАВЕТРАНЫЯ ВАННЫ

Акрамя сонечных ванн вялікае значэнне маюць паветраныя ванны. Галоўнае лекавае дзеянне паветраных ванн гэта ўмацаванне нервовай сістэмы, сардэчна-сасудзістай і дыхальнай сістэмы арганізма. Паветра для жыцця чалавека таксама неабходна, як і ежа. Паветраныя ванны праводзяцца ў цяні, у цяністым садзе, у агародзе, у лесе і т. д. Працягласць паветраных ванн—ад 10 мінут да 2 гадзін. Трэба памятаць, што нельга даводзіць сябе да азнобу.

Пачынаць паветраныя ванны трэба пры тэмпературы паветра не ніжэй 20° Ц. і пры самым слабым ветры.

ВОДАЛЯЧЭННЕ

Вельмі вялікае лячэбнае значэнне маюць вадзяныя ванны. Ужо ў глыбокай старажытнасці марскімі, рачнымі купаннямі і морскім паветрам карысталіся для лячэння розных захворванняў.

Ці прымяняем мы ваду, як лячэбна-прафілактычны сродак у сваім быту і на вытворчасці? Пакуль яшчэ вельмі недастаткова. А між тым вада з'яўляецца магутнай зброяй загартоўвання і ўмацавання арганізма. З гэтай мэтай вада можа быць скарыстана ў форме купання (рака, сажалка, возера, мора), абцірання, аблівання і розных душаў. Марскія, рачныя, возерныя купанні аказваюць на чалавека вялікі ўплыў: умацоўваецца нервовая сістэма, паляпшаецца сон, апетыт, павышаецца абмен вяшчэстваў, павялічваецца аддзяленне з арганізма мачавіны, хлора і серы, паляпшаецца дзейнасць органаў крывеабароту, дзейнасць кішэчніка і т. д. Купанні, як моцна дзейнічаючыя працэдуры, патрабуюць асцярожнасці, індывідуалізацыі і суровай дазіроўкі.

Найлепшы час для марскіх, рачных і другіх купанняў—ранні час (з 8 да 12 гадзін) пасля лёгкага снедання. Працягласць купання—ад 3 да 5 мінут. Пры малейшым прызнаку недамагання неабходна спыніць купанне. Не трэба купацца, калі вельмі стомлены. Уваходзіць у ваду трэба з сухой, не потнай скурай і выходзіць хутка. Купацца трэба зусім голым, купальны касцюм пазбаўляе цела дзейнасці марскіх і рачных хваляў. У вадзе неабходна рабіць рухі, а пасля з'явіўшайся купальнай рэакцыі, гэта значыць пачырванення скуры і адчування холаду—хутка выйсці з вады.

Пасля купання добра зрабіць невялікую не стамляючую прагулку, якая-б знішчыла купальную рэакцыю. Калі купанне праведзена правільна, то пасля яго з'яўляецца бадзёрасць, свежасць, палепшанне агульнага стану. Пры пагоршанні стану здароўя неабходна спыніць купанне і звярнуцца да ўрача.

Ва ўмовах калгаса кожны раўчук, рэчку можна скарыстаць для прыёму водных працэдур (абціранне, абліванне).

Водныя працэдуры ачышчаюць скуру ад пота і пылу. Яны з'яўляюцца ўзбуджальным і ўмацоўваючым сродкам.

Працоўныя павінны шырока скарыстоўваць сонца, паветра і ваду для ўмацавання свайго здароўя і аднаўлення сіл, як у часе адпачынку, так і на працягу ўсяго года.

Д-р Сезерын.

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН.

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом Працы, 3-ці паверх, пакой 8. Тэл. 24-058, 24-070.

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 655. Тыраж 13.050 экз. Уп. Галоўліта БССР № 351.
Здана ў друк. 21/V—39 г. Падпісана да друку 1/VI-39 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знак.

Инв. 1953 г. БА 663
БССР Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

ЦАНА 20 кап.